Тел 8-029-396-41-92
ИП Янцевич.А.И., УНП 590092316

ЧЕМПИОНАТ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ ПО ФУТБОЛУ

УВЕРЕННАЯ ВИКТОРИЯ

«Слоним-Сити» — «Неман» (Мосты) — 3:1 (2:1)

27 июня. г. Слоним. Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». 50 зрителей.

Судья — А. Олехнович (Гродно).

Голы: 1:0 — Тарасюк, 16; 2:0 — Виктор Берг, 29; 2:1 — Казючиц, 40; 3:1 — Нагорный, 80.

«Слоним-Сити»: Рупшис С. — Романюк, Берг Влад., Солдатенко, Дегиль, Молчанов (к) (Рупшис А.), Нагорный, Емельянчик (Хвесеня, Соколовский), Спасюк (Мочалов), Тарасюк (Эдер), Берг Виктор.

Тренер — Руслан Корнев.

Матч начался практически без раскачки. Хозяева на правах фаворита сразу же прибрали мяч к своим ногам и стали выискивать возможности для острых атак.

Автор забитого мяча Александр Нагорный

Первый по-настоящему опасный момент был у Виктора Берга, но форвард из выгодной позиции пробил выше. Похожий рейд к воротам соперника слонимчане сочинили на 16-й минуте игры. Многоходовка Нагорный — Молчанов — Емельянчик — Солдатенко закончилась передачей в район вратарской площади ворот, где в одно касание завершающий удар нанёс Олег Тарасюк. Затем последовало обострение возле ворот мостовчан, когда сам форвард Тарасюк шёл в обводку с двумя защитниками.

На 27-й минуте возник эпизод падения Виктора Берга не без помощи голкипера гостей. Пенальти. Но свисток арбитра промолчал. Спустя две минуты Виктор подхватил мяч на своей половине поля, сделал уверенное ускорение, оставил за спиной защитников соперника, вышел один на один с вратарём и увеличил счёт — 2:0. Затем оба нападающих упустили по голевому моменту, за что были наказаны незамедлительно.

Второй тайм не был таким зрелищным, как первый. Команды пытались малой кровью добыть голевые моменты. В первой же атаке слонимчане не сумели реализовать выход два в один. Запомнился эпизод, когда Виктор Емельянчик перемудрил с завершением окончательного удара. Произведённые замены не нашли усиления в игре. За десять минут до окончания встречи хозяева сумели завершить атаку взятием ворот. Виктор Берг из глубины поля вывел на ударную позицию Александра Нагорного, тот не стал улучшать позицию и метко пробил из-за пределов штрафной. В оставшееся время отменную реакцию демонстрировал Станислав Рупшис. Победа хозяев — 3:1.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

НОВОСТИ

В СЛОНИМСКОМ РАЙОНЕ ПРОШЁЛ ТУРСЛЁТ

На открытии турслета 26.06.15

В деревне Митьковичи Слонимского района на прошлой неделе прошёл районный туристический слет в программе круглогодичной спартакиады среди организаций города и сельскохозяйственных организаций района.

Команда ЖРЭО, водный этап

В спортивных состязаниях приняли участие девять команд: Слонимское УМГ, мясокомбинат, СПК им. Дзержинского и СПК им. Суворова, ГУП ЖКХ, водоканал, ЖРЭО, РОЧС, лесхоз.

На протяжении трёх дней проводились соревнования по волейболу, поднятию гири, дартсу, распиливанию брёвен, водный этап и другие. Также проходил конкурс туристических навыков и быта и конкурс стенгазет, посвященных Году молодежи. Для участников была организована дискотека.

В воскресенье, на закрытии турслёта, были награждены лучшие команды. Первое место завоевали туристы команды Слонимского мясокомбината, второе место заняла команда Слонимского УМГ, на третьем месте — команда ГУП ЖРЭО.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора и Алеся МАСЮКА

Туристическая полоса препятствий

Тренировка

Велоэтап

Фоторепортаж смотрите на сайте gs.by

ЧЕМПИОНАТ БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ. ПЕРВАЯ ЛИГА

БЕЗОГОВОРОЧНАЯ ПОБЕДА ЛИДЕРА

ФК «Слоним» — «Ислочь» (Минский р-н) — 0:3 (0:1)

28 июня. г. Слоним. Стадион «Юность», 1050 зрителей.

Судья — О. Черепнёв (Бобруйск).

Голы: 0:1 — Макар, 40; 0:2 — Мисюк, 62; 0:3 — Лебедев , 83.

ФК «Слоним»: Гомелько — Шаков, Красий, Снопко (к), Палазник, Плясунов (Бальбух), Пузач, Кириллов, Станкевич (Герасимчик), Казловский (Насанович), Юзвович (Холодков).

Тренер — Алексей Шубенок.

Матч прошёл под диктовку лидера первенства. Уже с первых минут гости прибрали к рукам игровую инициативу. Хозяева изредка участвовали в атаках, а если они и были, то до остроты дело не доходило.

Выдвинутый вперёд Дмитрий Юзвович в одиночку не сумел оправдать возложенные на него обязанности — пытался прессинговать, вот только партнёры не помогали. Лидер атак слонимчан Владимир Шаков оказался на непривычной для его позиции — центрального защитника.

Постепенно приезжие футболисты стали угрожать воротам Артёма Гомелько. Страж ворот хозяев сумел отразить два удара со средней дистанции, после того как ошибся в центре поля Михаил Кириллов. Артём вышел далеко из ворот и не позволил нападающему гостей огорчить команду. За пять минут до антракта и он не смог спасти от неминуемого гола. Удар со штрафного был разящим и красивым по исполнению — мяч точно попал в девятку ворот слонимчан — 0:1.

Вторая половина матча практически не видоизменила игру ФК «Слоним». Моментами гости заставляли прижаться к своим воротам хозяев. Игра в это время изобиловала множеством стенок и коротких передач, а на подступах к воротам соперники стали наносить опасные удары. В одном из таких эпизодов рикошетом мяч от Евгения Снопко угодил в рамку ворот слонимчан — 0:2.

После второго пропущенного мяча хозяева чаще стали проникать на половину поля гостей. Даже сумели сподобиться на удар по воротам, но мяч отразила перекладина. В концовке встречи гости вновь напомнили о себе. Несколько ловких и техничных движений с мячом позволили довести счёт до крупного.

Егор ЖИГАЛИК
Фото Евгения ВОЛОДАЩУКА

ПОГЛЯД

АЧМУРАНЫЯ ПРАПАГАНДАЙ

Гледзячы каналы расійскага тэлебачання з іх агрэсіўнай антыўкраінскай рыторыкай, прыгадаў прапаганду савецкіх часоў пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя, калі ў Польшчы нарасталі пратэстныя акцыі і Савецкі Саюз рыхтаваў туды ўвод войск.

Грамадства да ўспрыняцця такога акта таксама рыхтавалі. Рыхтавалі не праз СМІ, а праз чуткі, недамоўкі. Напоўніцу быў задзейнічаны прапагандысцка-лектарскі патэнцыял.

Паралелі

У 1980 годзе да сваякоў у Масты прыехалі родныя, што з'ехалі ў Польшчу пасля вайны. Затым мастаўляне атрымалі запрашэнне ў Польшчу. Але там ідуць забастоўкі. Паездка некалькі разоў адкладвалася. Урэшце польскім сваякам гэта надакучыла, і мастаўляне атрымалі такі допіс: "Вы так старанна будуеце свой камунізм, што не маеце часу наведаць нас".

У верасні 1981 года праходзіла навучанне прафсаюзных актывістаў у Гродне з усёй вобласці. Якраз напярэдадні ў СССР адбылося павышэнне цэн. Паліцы магазінаў былі пустыя. На семінары пра тое — ні слова.

Напрыканцы чыталі лекцыю аб палітычным становішчы, цалкам прысвечаную Польшчы. Лектар з прапагандысцкай арганізацыі "Веды" так і сыпаў лічбамі: "У Польшчы 1 млн. гандляроў. 16 млн. палякаў жыве на Захадзе. Уласнікаў зямлі болей, чым у Заходняй Германіі і Францыі. Надзелы зямлі адносна нашых калгасаў малыя. Паўсюдна прыватныя лаўкі. З павесткі дня зняты палітычныя лозунгі. Доўг складае 31 млрд. даляраў. Бяруцца новыя пазыкі пад 200%. Герак (былы сакратар ПАРП) адданы пад суд".

Прысутных уражваюць лічбы. Ім бачыцца гаротны стан палякаў. І тут лектар кажа адкрытым тэкстам: "Неабходны ўвод савецкіх войск у Польшчу".

У кастрычніку 1981 года ў актавай зале Мастоўскага райкама партыі чыталі лекцыю аб міжнародным становішчы. Прысутных было не болей за два дзясяткі. Дакладчык прапанаваў прысутным задаваць пытанні. Усе пытанні зноў былі пра сітуацыю ў Польшчы. І зноў лектар збянтэжыў прысутных лічбамі: 80% зямлі — у прыватных уладальнікаў, з якіх болей за 70% — людзі сямідзесяцігадовага ўзросту. Частка гаспадарак без мужчын. Моладзь з'ехала ў вялікія гарады і на поўнач (разумей Гданьск, Гдыня, адкуль пачаліся пратэстныя акцыі) і ўнесла ў рабочае асяроддзе сваю непралетарскую ідэалогію. Горш за тое, камуністы ходзяць да касцёла. Усё тое пераказваецца дома, у калектывах, прыватных гутарках.

Праз тыдзень ва ўсіх партарганізацыях раёна быў зачытаны ліст ЦК КПСС аб сітуацыі ў Польшчы. Амаль слова ў слова тое, пра што казалі лектары.

13 снежня 1981 года ў Польшчы ўвялі каменданцкую гадзіну. Арыштавалі кіраўніцтва і сяброў "Салідарнасці", КОС-КОР. У Варшаве адключылі АТС. У гарадах узмацнілі міліцэйскія і вайсковыя патрулі. Распусцілі ўсе арганізацыі. Па тэлебачанні і радыё круцілі выступ генерала Ярузельскага.

На працы, у крамах, на вуліцах усе абмяркоўваюць тую падзею. Думка адна: даўно пара зрабіць так. І тут сказала сваё слова тэлебачанне ў вячэрняй праграме навінаў "Час". "Польшча — боль наш", — заявіла ТАСС. І тут жа паказалі Варшаву з пустымі паліцамі крамаў, амаль бязлюдныя вуліцы. І патрулі — на вуліцах, вакзалах, у вузлах сувязі, вугальных капальнях — паўсюдна.

Падзейнічала на псіхіку. Аднак праца лектараў не спынялася.

У жніўні 1982 года тэлебачанне Саюза паказвае пратэсты ў Варшаве. У справу пайшлі вадамёты, слезацечны газ і міліцэйскія дубінкі. З майго асяродку ўсе выказвалі таму "адабрамс".

У верасні 1982 года палітінфарматар з Гродна перад калектывам Мастоўскай вылічальнай станцыі распавядаў пра падзеі ў Польшчы. Як важкі аргумент, што ваенны стан мала паўплываў на становішча ў краіне адзначыў факт, што службу ў касцёле паказваюць па тэлевізары. Увесь астатак дня невялікі калектыў абмяркоўваў гэтае паведамленне: як можа тэлевізія сацыялістычнай краіны паказваць богаслужэнне?

Сёння мне падаецца незразумелым выказванне аб тых падзеях паважанага мною чалавека, знакамітага пісьменніка Аляксея Карпюка, улетку 1983 года. На сустрэчы з пісьменнікам Аляксей Карпюк на пытанне, як ён ставіцца да падзей у Польшчы, адказаў: "Тое, што там адбываецца, — не па мне".

Рэаліі

Сёння Расія напоўніцу скарыстоўвае электронныя СМІ як прапагандысцкую машыну. І тое дзейнічае бездакорна.

86-гадовая кабета, бежанка з Украіны, бацька якой у 1937 годзе быў арыштаваны НКУСаўцамі і расстраляны, штодня глядзіць пра падзеі ва Украіне па расійскіх тэлеканалах і новую ўладу называе бандэраўскай. Яна пра тамтэйшыя падзеі ведае не толькі з расійскіх тэлеканалаў, бо часта тэлефануе ў Кіеў да пляменніцы і пытае пра сітуацыю ва Украіне, але лжывая прапаганда перамагае ў яе свядомасці.

Пяцідзесяцігадовы беларус, зяць якога заключыў кантракт з бельгійскай фірмай, працуе там і забраў з сабою жонку з двума дзеткамі, цвёрда верыць, што НАТА хоча паставіць ракеты ва Украіне і захапіць Расію. На яго не дзейнічаюць ніякія аргументы. Нават той факт, што дзеці яго жывуць у адной з краін альянсу і нішто ім там не пагражае, для яго не аргумент. А аргумент яго доказаў адзін: бачыў ці чуў па тэлевізары.

Фактаў сённяшняга прапагандысцкага ачмурэння можна прыводзіць бясконца. Мазгі лёгка затуманіць, але развейваецца той туман доўга.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НОВОСТИ

НА СОВЕТСКОЙ ПЛОЩАДИ В ГРОДНО ПОЯВИЛИСЬ СОЛНЕЧНЫЕ ЧАСЫ

Специалисты "Гроднозеленстроя" установили на Советской площади областного центра солнечные часы.

Солнечные часы расположены на огромной клумбе круглой формы перед Фарным костелом. Высажен цветочный циферблат, на котором шесть цифр. В ясные дни специалисты ГУРСП "Гроднозеленстрой" по тени от стрелки настроят время. Молодые архитекторы предприятия таким образом восстановили традицию прошлых веков, заложенную гродненским старостой и подскарбием Великого княжества Литовского Антонием Тизенгаузом.

Гродненские историки не отрицают тот факт, что солнечные часы были во дворце Тизенгауза. На фотографиях дворца гродненского старосты Антония Тизенгауза, сделанных основателем историко-археологического музея в Гродно Иосифом Йодковским, видны гномоны — вертикальные обелиски со шкалой, нанесенной на земле или плитах у их основания.

Гномоны были первыми солнечными часами еще с библейских времен и служили людям до раннего Средневековья. Конец тени указывал время суток. Существовала даже целая наука — гномоника — искусство строить кривую на циферблате солнечных часов, которая бы указывала "средний" полдень в любое время года. В основном ими пользовался простой люд на площадях и рынках. Можно предположить, что два обелиска перед фасадом дворца выполняли в XVIII веке роль гномонов, указывая своими тенями на наступление полдня (12 часов дня).

Солнечные часы в XVIII веке были сооружены у костела в деревне Ищелно Щучинского района, в Лиде около кинотеатра "Юбилейный" — в 2008 году.

"Гродненская правда"

НЕ ПОДЕЛИЛИ МЕСТО НА РЫНКЕ: ПЕНСИОНЕРКЕ СЛОМАЛИ РУКУ

В Волковыске местная пенсионерка и заезжие продавцы сельхозпродукции не поделили торговое место на рынке. Завязавшийся конфликт закончился тем, что у женщины оказалась сломанной рука, сообщили в УВД Гродненского облисполкома.

События развивались следующим образом. В Волковыск из Пинска приехали отец и сын и расположились возле базара. Вскоре к ним подошла пенсионерка, сообщив, что это "ее место", и в подтверждение указала на оставленные ею лотки.

У родственников была своя правда — они приехали раньше, поэтому уступать не хотели. В ходе конфликта сын толкнул старушку, да так сильно, что она упала, сломав при этом руку. После инцидента обидчик дождался милицию.

За нанесение повреждений возбуждено уголовное дело, пояснил замначальника отдела охраны правопорядка Волковысского РОВД Александр Кузьма.

TUT.BY

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

ВЫПАДАК У ДАРОЗЕ

Людзей у вагоне прыгараднага цягніка было шмат, але месца для сядзення хапіла ўсім. Погляды многіх прыцягваў чалавек сярэдняга веку. Ён быў у чорных акулярах, праз усю правую шчаку яго цягнуўся ліловы шнар. Шнар быў і на шыі, але не такі шырокі. Рукі яго, белыя, худыя, што, здавалася, можна палічыць ўсе костачкі на кісцях, ляжалі на кульбе — чорнай, відаць ад доўгага ўжывання адглянцаванай да бляску.

Цягнік ужо гатовы быў адправіцца з чарговага прыпынку, як з тамбура ў вагон зайшла занадта вясёлая кампанія маладых хлопцаў. Іх было трое, і ўсе на добрым падпітку. Гаманлівыя, бесцырымонныя, яны селі акурат насупроць чалавека ў чорных акулярах, пацясніўшы да акна бабулю з плеценай карзінай і вялікай дарожнай сумкай.

—Пасунься, старая, а то ты нам будзеш замінаць! — голасна прамовіў старэйшы з іх, той, што быў у аблезла-шэрай бейсболцы, надзетай казыркам назад.

—Няхай сядзіць, можа, яна складзе нам кампанію, — зарагатаў другі, нізкарослы, але шырокі ў косці. Спартыўны касцюм на ім быў не па росце вялікім, калашыны штаноў наязджалі на кеды так, што амаль дакраналіся да падлогі.

На яго словы кампанія дружна зарагатала, а найбольш зычна высокі прышчавы хлопец у бруднай белай майцы з надпісам на англійскай мове.

Бабуля падхапілася з сядзення, узяла свае рэчы і хацела перайсці на другое месца, каб пазбавіцца такой кампаніі, але яе перапыніў чалавек у чорных акулярах:

—Сядзіце, чаго вы ўсталі? Яны будуць паводзіць сябе прыстойна. Праўда, хлопцы?

Яны не адказалі. Старэйшы дастаў з цэлафанавага пакета бутэльку таннага віна. Адкаркаваўшы, хацеў выпіць проста з горла, але чалавек у акулярах імгненна ўскочыў на ногі і выхапіў бутэльку з рук. Ён пахіснуўся, ледзь утрымаўся на нагах, і каб не бабуля, якая схапіла за крысо пінжака, то, напэўна, упаў бы.

—Дзядзька, ты што? — здзівіўся і абурыўся той, у каго адабралі бутэльку. — Чаго ты чапляешся да добрых людзей? Мы ж цябе не чапаем.

—І праўда, аддай бутэльку, — падтрымаў яго прышчавы.

У вагоне ўсталявалася цішыня, толькі аб нечым шапталіся дзве кабеты на суседнім сядзенні. Потым адна прамовіла:

—Чалавек, калі пачняце біцца, то ты будзеш вінаваты. Мы ўсе засведчым, што яны нічога дрэннага не рабілі, а ты вырваў з рук бутэльку. Аддай.

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

—Аддам, мне яна зусім не патрэбна. Толькі і ім не патрэбна гэтае віно, бо ўжо дастаткова п'яныя. Я не зла, а дабра ім хачу…

Ён змоўк, маўчалі і ўсе. Хлопцы ўжо не абураліся, а насцярожана слухалі. А чалавек працягваў.

—Даўно, калі я быў у іхнім узросце, а гэта гадоў трыццаць таму, здарыўся са мной такі выпадак. Я тады вучыўся ў ПТВ і на выхадныя разам з сябрамі ехаў у цягніку дадому. Мы прыйшлі на чыгуначны вакзал ужо на добрым падпітку. Пяцёра нас было. Міліцыянеры заўважылі нашу, так бы мовіць, цёпленькую кампанію і хацелі затрымаць. Але мы паказалі білеты на цягнік, які адпраўляўся праз пару хвілін, і нас адпусцілі.

Мала таго, што былі выпіўшыя, з сабой мелі яшчэ дзве бутэлькі віна. Размясціліся ў вагоне так, як во яны, і адразу ж прыклаліся да бутэлькі. Адну асушылі, потым другую. Гаманілі, рагаталі, не зважаючы на іншых пасажыраў, вядома, п'янаму мора па калена. Мой прыпынак быў самы першы. Віхляючыся па праходзе вагона, я накіраваўся ў тамбур. Сябрукі наважыліся праводзіць, але тут нечакана іх спыніла праваднічка, і я пайшоў. Вываліўся з вагона якраз тады, калі машыніст зачыніў дзверы. Я не ўтрымаўся на прыступках і паляцеў пад вагон. А цягнік ужо крануўся…

Апамятаўся ў рэанімацыі. Адразу і не зразумеў, дзе я, што са мной: правае вока не бачыць, правай нагі няма. Спачатку думаў, што гэта сон, бо п'яны ж быў і нічога не памятаў. А як дайшоў да розуму, не заплакаў — завыў на ўсю бальніцу. "Раней трэба было плакаць, — сказаў малады доктар, што прыбег на мой голас: "А цяпер ужо позна, трэба прывыкаць да новых абставін, вучыцца жыць без вока і нагі. Вось так, галубок. Нездарма ў народзе кажуць: ніхто так не зробіць, як сам сабе".

З вясёлага, прыгожага рухавага хлопца я ператварыўся ў бездапаможнага калеку. Ад непапраўнага гора без пары сышлі ў магілу мае бацькі. А я застаўся адзін на ўсім белым свеце. Ні пра якую вучобу і думаць не думаў. І працаваць таксама не мог. З адным вокам, з адной нагой… Прызначылі мне маленькую пенсію, такую, каб з голаду не памёр. А я і тую прапіваў. А калі грошы заканчваліся, хадзіў жабраваць. У царкве на цвінтары сядзеў. Так і прапаў бы, як кажуць, ні за панюшку тытуню, каб не сустрэў добрага і спагадлівага чалавека. Неяк зімой падабрала мяне пад плотам — п'янага, ледзь жывога — адна маладзіца. Жыла яна адна, бо муж памёр. Прыцягнула дадому, адмыла, накарміла, распытала, хто і што са мной. Даведаўшыся праўду, сказала:

—Калі не будзеш піць, то заставайся жыць у мяне. Удваіх лягчэй. Я нянечкай у дзіцячым садку працую. Заробак, праўда, невялікі, але разам з тваёй пенсіяй нейкая капейка збярэцца.

З таго часу, а мінула ўжо дваццаць шэсць гадоў, я жыву ў яе. Пра спіртное забыўся, якое яно на смак, бо даў слова той добрай кабеце, якая потым стала маёй жонкай.

У вагоне стаяла цішыня. Чалавек у акулярах, які да гэтага часу ўсё яшчэ трымаў у руках бутэльку віна, працягнуў яе хлопцам.

—Зразумелі цяпер, чаму я адабраў?

—Дзякуй. Мы яго выльем, — прамовіў старэйшы.

Калі цягнік спыніўся, яны выйшлі з вагона. Можа, гэта быў іхні прыпынак, а можа, пад уражаннем ад пачутага ім трэба было падумаць…

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВЕСТКІ З МАСТОЎШЧЫНЫ

МАСТАЎЛЯНІН СПОЙВАЎ ГАРАДЗЕНЦАЎ

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю гродзенскай міліцыі напрыканцы мінулага тыдня ў Гродне на кватэры, якую здымаў мастаўлянін, падчас агляду выявілі 32 пластыкавыя пяцілітровыя ёмістасці са спіртазмяшчальнай вадкасцю.

Агулам было канфіскавана 160 літраў самапальнай гарэлкі.

ДА БОГА БЕЗ БОГА

У ноч з суботы на нядзелю ў Мастах ад праваслаўнага і каталіцкага крыжоў, устаноўленых на скрыжаванні вуліцы 30 гадоў УЛКСМ і праспекта Юнацтва, невядомыя скралі вянок і выкінулі ў кусты за пяцьдзясят метраў.

На наступны дзень прыхаджане накіраваліся да царквы іконы "Усіх смуткуючых Радасць" на набажэнства, але ніхто з іх не звярнуў на тое ўвагі. Ніхто не вярнуў вянок на месца, калі ішоў са службы, хоць ён добра бачны з ходніка.

Гэты ходнік мнагалюдны, паколькі вядзе да чыгуначнай станцыі, і бачыла тое не адна сотня людзей. Але вянок так і застаецца там.

ДЗЯРЖКАНТРОЛЬ ЗАНЯЎСЯ СМЕТНІКАМІ

Камітэт дзяржаўнага кантролю па Гродзенскай вобласці доўга ўстанаўліваў гаспадара сметніка цвёрдых бытавых адыходаў ля вёскі Лунна Мастоўскага раёна, які цяпер нагадвае дзікую звалку.

Высветлілася, што палігон быў утвораны ў 2004 годзе і належыць Мастоўскай жыллёва-камунальнай гаспадарцы.

За падобны стан сметніка камунальшчыкі вінавацяць мясцовых жыхароў. Тое, што за яго станам адсутнічае належны кантроль, тлумачаць вялікай колькасцю такіх палігонаў у раёне.

Яшчэ дзесяць гадоў назад была 51 такая звалка смецця, цяпер засталося толькі 33. Падобна, што вясковыя жыхары ў большай ступені выкідаюць смецце куды папала, далей з двара.

КАМУНАЛЬШЧЫКІ НАЗВАЛІ МАСТОЎСКІХ «МІЛЬЯНЕРАЎ»

Камунальныя службы абвясцілі спісы сваіх даўжнікоў з прозвішчамі, адрасамі і сумамі доўгу.

У трох чалавек тая запазычанасць складае больш за 20 млн. рублёў. Яшчэ ў аднаго — 11 мільёнаў.

Большасць у тым спісе складаюць даўжнікі, якія не сплачвалі камунальныя паслугі, відаць, толькі адзін раз, бо доўг іх складае не больш за 200 тысяч рублёў.

ПА ПУШЧЫ ЕЗДЗІЛІ ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ

У сярэдзіне чэрвеня на ўскрайку Ліпічанскай пушчы, каля вёскі Навінка, прайшоў традыцыйны трофі-рэйд "Партызанскія сцежкі – 2015" другога этапу Кубка Заходняга рэгіёна.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел 80 экіпажаў уседарожнікаў з розных краін. У праграме мерапрыемства — 20-гадзіннае GPS-арыентаванне. Арганізатарамі спаборніцтваў выступіла пярвічка Гродзенскага ДТСААФ "Поўны прывад".

НА МАСТОЎШЧЫНЕ ПРАЦЯГВАЮЦЬ СВЯТКАВАЦЬ ПЕРАМОГУ

Ля вёскі Каралі 26-27 чэрвеня прайшоў раённы турыстычны злёт рабочай моладзі, прысвечаны 70-годдзю Перамогі.

Сярод запланаваных праграмаў патрыятычнага выхавання моладзі быў і конкурс "Бодзі-арт" — на лепшае і арыгінальнае нанясенне малюнка на цела аднаго з удзельнікаў каманды з дапамогаю гуашы і фарбаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

АНОНС

МЕРОПРИЯТИЯ, ПОСВЯЩЁННЫЕ ДНЮ НЕЗАВИСИМОСТИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ 3 ИЮЛЯ

ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

Памятник погибшим воинам (сквер по ул. Пушкина)

11.00 — торжественный митинг
— возложение венков
— прохождение торжественным маршем войск гарнизона
— автомотопробег по местам боевой славы
— шествие общественности города, гостей и трудовых коллективов

Центральная площадь

11.40 — Открытие праздника. Поздравление председателя Слонимского райисполкома Олега Таргонского
11.50-13.00 — Концерт артистов Гродненской областной филармонии
13.00-13.10 — Приветствие делегаций и гостей праздника
13.10-13.25 — Награждение
“Талентаў шматкаляровы букет”
13.25-16.30 — Концерт творческих коллективов и исполнителей города и района
18.30-19.30 — Эстрадный концерт солистов Слонимского центра культуры и отдыха
“Зорны вечар”
19.30-22.25 — Концерт артистов белорусской эстрады
В концерте принимают участие:
— Дария
— Алексей Гросс
— Иван Буслай
— фольк-медиа-группа “Гасцінец”
— арт-группа “Беларусы”
22.25-22.55 — Продолжение концерта солистов Слонимского центра культуры и отдыха
22.55 — Всебелорусская акция «Споём гимн вместе»
23.00 — Праздничный фейерверк

Центральная площадь

“Прапануем прысмакі на розныя смакі”
11.00-23.00 — Праздничная торговля
11.00-16.30 — Выставка предприятий города
“Народная творчасць — крыніца натхнення”
11.00-16.30 — Выставка изделий народного творчества и декоративно-прикладного искусства

Двор Дома ремесел

“Гасцінны дворык”
11.00 — Выставка-продажа продукции ОАО “Слонимский мясокомбинат”

Улица К. Маркса

“Запрашаем на падворкі”
11.00 — Сельские тематические подворья

Улица Красноармейская и площадка у центра культуры

11.00 — Игровые аттракционы “Разгуляй городок”
— Спортивные игры

Слонимский краеведческий музей им. И.И. Стабровского

12.00-17.00 — День открытых дверей

Площадка у центра культуры

“На адзінай хвалі”
16.30-18.30 — Танцевальный марафон (духовой оркестр, народный ансамбль песни “Славяночка”)

По информации сайта Слонимского райисполкома

Анекдоты

— Да ладно, мы же не каждую пятницу пьем.
— Просто ты не каждую помнишь!

☺ ☺ ☺

Едут в поезде русский и австралиец.
Тут русский проголодался и достает вареные куриные яйца.
Австралиец спрашивает у него, что это такое.
А русский и отвечает:
— Яйца.
Австралиец:
— Вот у нас страусиные яйца так яйца, на всю семью хватает одного.
Тут русский достает окорочок.
Астралиец:
— А это что такое?
Русский:
— Окорочок.
Австралиец:
— Вот у нас страусиный окорочок так окорочок — один сварил, и всей деревней наелись.
Тут русский из-под сиденья выкатывает арбуз.
Австралиец:
— А это что такое?
Русский:
— Крыжовник.

СОВЕТЫ ДАЧНИКАМ

от слонимчанки Натальи Семенович

РАСТИ, РЕПКА...



Очень полезный корнеплод неоправданно забыт и вытеснен с участков многих дачников. Но ведь этот овощ не уступает многим другим по содержанию витамина С, а некоторых даже превосходит. Употребление свежей репы укрепляет иммунитет, снижает риск развития сахарного диабета, рака и даже помогает похудеть.

Июнь, начало июля, в этот период обычно освобождаются грядки с ранним картофелем, что очень удобно для посева репы на хранение.

Агротехника репы при летнем посеве не так и сложна. Главное — свет, влага и рыхлая почва, так как глинистые почвы репа не любит.

Не стоит сажать репу после растений семейства крестоцветных — капусты, редиса, редьки, а вот лучшими предшественниками являются ранний картофель, кабачки, огурцы, томаты.

Посев производят предварительно прогретыми в горячей (40-50 С) воде, просушенными и смешанными с песком семенами, рядовым способом.

После прорастания репу посыпают золой, что служит защитой от крестоцветной блошки, а также отличным удобрением.

Уход в основном заключается в прополках, рыхлении (чем тверже почва, тем меньше и уродливее корнеплоды) и прореживании по мере необходимости, но особое внимание стоит уделить поливу, так как репа требовательна к влаге. Поливать следует не менее 2 раз в неделю, иначе корнеплоды будут мелкими и сильно горчить.

Лучшим удобрением станет раствор навозной жижи 1:10.

Сбор урожая производится выборочно, из-за неравномерного созревания репы. Очищенные от ботвы корнеплоды можно хранить в небольших емкостях с песком или вымытые, обсушенные, упакованные в пакеты в холодильнике.

На сегодняшний день существует множество различных сортов репы разного срока созревания, разной окраски, для длительного хранения и непосредственного употребления. Поэтому советую всем дачникам взять на заметку этот чудесный овощ, который можно использовать как в свежем виде, так и в пареном, тушеном, отварном, при этом получая огромную пользу от витаминов и микроэлементов и удовольствие от собранного на собственном участке урожая.

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 2-Е ПОЛУГОДИЕ 2015 ГОДА			
«Газета Слонимская» + «Отдушина»	на 1 месяц	на квартал	на полугодие
	30 000	90 000	180 000

АНОНС

РЕКЛАМА ПРИНИМАЕТСЯ

В День Независимости РБ, 3 июля, пункт приёма рекламы «Газеты Слонимской» на ул. Красноармейской, 73Б работает с **9.00** до **15.00**.

Редакция «ГС»

РАСПИСАНИЕ ПОЕЗДОВ ЖДИТЕ В СЛЕДУЮЩЕМ НОМЕРЕ

В следующем номере газеты по просьбе читателей будет напечатано расписание движения поездов со станций «Барановичи-Полесские» и «Барановичи-Центральные» на июль 2015 года.

Редакция «ГС»

С НАТУРЫ

НАЧАЛО РАБОЧЕГО ДНЯ

Дождь едва моросил. Но всё же стоять под крышей автобусной остановки было приятнее. Если бы не два мужика. Молодой, 25-30 лет, и более пожилой, явно за 50. Оба курили. И разговаривали матом.

РИСУНОК ЕВГЕНИЯ ИВАНОВА

Табачный дым застаивался под крышей остановки. Не хотел выползать и смешиваться с влажным воздухом. Молодой парень выдувал затяжки с удовольствием и говорил скупо, для вежливости. Зато обильно рассказывал пожилой мужик. Мол, какие они все умные, купишь что-то и будешь переплачивать. Хотя якобы беспроцентный кредит, лишь бы купил.

Для него было плохо всё. Само существование этих магазинов, что товары в кредит дают. Сами товары: ведь железо, а оно ржавеет и ломается.

Подошли две женщины. Одна годилась в матери для молодого мужика, вторая походила на бабушку для пожилого. Та, что бабушка, прикрикнула и заставила мужиков выбросить сигареты. Выбросили окурки без возражений. И говорить матом перестали. Обе женщины, хотя и порознь, но знали этих мужиков. Разговаривали с ними ласково и не церемонясь. Словно вчера расстались. Молодой парень даже улыбаться начал. Женщины были пожилые, но знали себе цену. Как-то веско у них получалось сказать каждое слово. Невольно заулыбался и пожилой мужик. Буквально расцвел.

С увлечением взялся рассказывать о маме. Она в деревне. Мама замечательная: вкуснейший самогон изготавливает. Густой и жирный, как сметана, и сладкий, как варенье. Но ему не дает. «Ни-ни», — он для убедительности сделал движение пальцем возле своего носа. Мама составит комбинацию из выварки и алюминиевой мисочки, бражки зальет, сверху тазик с водой, всё на газ, две конфорки включила, и час спустя можно пробовать.

Две женщины напряженно думали: может ли самогон быть одновременно густым и сладким? А мне понравилось это вдохновенное враньё.

Подошел автобус. Все участники сцены забрались внутрь. Я тоже.

Время ожидания — 16 минут, а сколько непринужденных переходов от реальности к необузданной фантазии.

Владимир ШУМЕЛЬ

Есть интересный факт, что каждую секунду в мире рождается четыре ребенка, это значит, что каждый день где-то просыпается годовалый именинник или солидный юбиляр.

Кто-то рассказал, что с тех пор, как рухнули две башни мирового торгового центра в Нью-Йорке, американцы, поздравляя друг друга с днем рождения, ограничиваются пожеланиями счастья, не делая акцента на богатстве, процветании и здоровье. Почему? Всем вдруг стало ясно: жить — это уже счастье! Потому что те, кто находился тогда в этих небоскребах, имели всё, кроме счастья…

Один «мозголом» подсчитал, на что уходят 70-80 лет жизни одного человека. Если ежедневно на нужды гигиены уходит 30 минут — то 1,5 года мы приводим себя в порядок. На прием пищи тратится 2 часа в сутки, значит, 6 лет человек ест. Спит 23 года, если на сон уходит 8 часов. Не беря в счет годы детства, юности и учебы, то по времени получается 48 лет активной трудовой деятельности (без учета, что пенсионеры могут работать и дольше) и в результате — 11,5 лет человек на рабочем месте. Если ежедневно на транспорт уходит примерно час, то катаемся мы уже два года. Телевизор забирает 6 лет, если мы смотрим его 2,5 часа. Час на прессу — то читаем её мы два года. В итоге — 52 года позади. Можете сами подсчитать, сколько лет вы просиживаете за кружкой пива или сколько лет прокурили. Кстати, ежегодно в мире производится около 1 триллиона 980 миллиардов сигарет. При этом каждый год обрывается жизнь у 1 миллиона 200 тысяч заядлых курильщиков. Если вы были подвержены этой пагубной привычке, можно считать, что потраченные на неё годы вы пытались убить себя. И если уже начали считать, то посчитайте, сколько времени вы делали другим добро, а сколько эгоистично жили для себя. Сколько потратили на нежности и сколько на обиды…

Неплохо держать «циферблат» личной жизни перед глазами — это помогает стать хозяевами своего времени, и тогда каждый год, подытоженный датой нашего рождения, не будет прожит бездарно.

Алёна АЛЬКО

АФИША

Кинотеатр «Мир»

1 июля

Зал — «Опасное погружение», Великобритания, триллер, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «22 минуты», Россия, боевик, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

2 июля

Зал — «Опасное погружение», Великобритания, триллер, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «22 минуты», Россия, боевик, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

3 июля

Зал — «Дорога на Берлин», Россия, военная драма, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «22 минуты», Россия, боевик, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

4 июля

Зал — Детский сеанс «Незнайка летит на Луну», Россия, мультфильм, начало в 14.00, «Дорога на Берлин», Россия, военная драма, сеанс в 16.00, Дискотека. Начало в 19.00

Видеосалон — «22 минуты», Россия, боевик, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

5 июля

Зал — Детский сеанс «Незнайка летит на Луну», Россия, мультфильм, начало в 14.00, «Дорога на Берлин», Россия, военная драма, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Видеосалон — «22 минуты», Россия, боевик, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Театр

5 июля

Для детей — «Морская невеста», начало в 12.00, цена 25 000 рублей

Для взрослых — «Мою жену зовут Морис», начало в 17.00, цена 40 000 рублей

11 июля

На площадке супермаркета «АЛМИ» с 10.00 до 16.00, проспект Независимости, 18, состоится бесплатный тест-драйв автомобилей новой серии Volkswagen

«ГАЗЕТУ СЛОНИМСКУЮ» МОЖНО КУПИТЬ В МАГАЗИНЕ «КОНТИНЕНТ», КОТОРЫЙ НАХОДИТСЯ НА УЛ. ПУШКИНА, 13
ТЕЛ. 8-044-58-42-151 ВЕЛ.
ПРОДАЁМ ДВЕРИ ЛАМИНАТ САЙДИНГ
imax

ЧТУП Якацук, УНП 590857937

«ГАЗЕТУ СЛОНИМСКУЮ» МОЖНО КУПИТЬ В МАГАЗИНЕ «АЛЬФА», КОТОРЫЙ НАХОДИТСЯ НА УЛ. Я. КУПАЛЫ, Д.3
НЕ ПОМНИШЬ, СКОЛЬКО ЛЕТ ТВОЕМУ ДИВАНУ? МЕНЯЕМ СТАРЫЙ НА НОВЫЙ СО СКИДКОЙ ДО 2 000 000.
Рады видеть вас по адресу: ул.Я.Купалы, д.3, тел. 6-82-82
ЧПТУП «Энеротрейд», УНП 590323571

НАШИ ДЕТИ

СПАСЕНИЕ ЯШИ

Анастасия Крук со своим другом Яшей

Одиннадцатилетняя брестчанка Анастасия Крук приехала к бабушке в Слоним на каникулы и приобрела себе необычного друга.

По словам Насти, к ним в гости зашла соседка, которая держала в руках крохотного птенчика.

— Настя, этот воробышек выпал из гнезда, я его и подобрала. Жалко. Может, поухаживаешь за ним? Глядишь, и летать научится, — сказала женщина.

Девочка согласилась. Назвала птенца Яшей. На балконе соорудила ему жильё из коробки. Поила найдёныша из шприца, кормила зёрнышками.

Теперь Яша уже окреп, скачет по балкону и чирикает. Девочка надеется, что скоро её друг научится летать и она его выпустит на волю.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора

КАЗКА

СЕМ ГІСТОРЫЙ ПРА ВОЎКА І ВОЖЫКА

ГІСТОРЫЯ ШОСТАЯ

Па сцяжынцы, падскокваючы, бег Заяц. Ён спяшаўся да Вожыка. Сёння Вожык запрасіў яго ў госці. Сказаў, што нядаўна купіў кнігу з прыгожымі малюнкамі.

Спачатку яны паглядзяць малюнкі, ацэняць іх, а потым кнігу будуць чытаць. Цікава пройдзе дзень.

Добра, калі ёсць надзейны сябар, такі, як Вожык. З ім ніякі Воўк не страшны.

Заяц мінуў паваротку і ўбачыў Воўка і Лісу. Яны стаялі каля ямы, выкапанай на сцяжынцы.

"Штосьці нядобрае задумалі гэтыя хаўруснікі. Трэба паназіраць за імі", — падумаў Заяц. Ён хацеў схавацца ў кустах, але Ліса яго заўважыла.

— Зайчык да нас прыбег! — усклікнула. Рыжуля аж свяцілася ад радасці. Здавалася, зараз падыдзе да Зайца і абніме як роднага.

— Чаму яму на сцяжынцы выкапалі? — крыкнуў Заяц.

Воўк чмыхнуў носам, а Ліса нечакана паведаміла:

— Воўк такое пакаранне сабе прыдумаў.

— Яму капаць? — вырвалася ў Зайца. Азадачыла яго Ліса.

— Гэтую яму ён неўзабаве засыпле, — далей вядзе сваю гаворку Ліса. — Потым зноў выкапае і зноў засыпле.

— Доўга так будзе капаць і засыпаць? — пацікавіўся Заяц. "Магчыма, праўду кажа рыжуля. Бываюць жа дзівосы на свеце", — падумаў ён.

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

— Пакуль зусім не стоміцца! — гукнула Ліса і закруціла хвастом. "Будзеш наш, Зайчык, не ўцячэш", — прамільгнула ў яе галаве.

— Я Вожыка пакрыўдзіў. Таму і прыдумаў сабе такое пакаранне, — падаў голас Воўк. Ён вырашыў дапамагчы Лісе. Вельмі ж хацелася яму цяпер схапіць і правучыць Зайца. "Калі б не ты са сваім алібі, то Барсук асудзіў бы Вожыка, быў бы мой верх. З высока ўзнятай галавой хадзіў бы", — падумаў ён.

— Глыбокую яму ты выкапаў? — запытаўся ў Воўка Заяц.

— Падыдзі і паглядзі, — прапанавала Ліса.

— Я падыду, а вы схопіце мяне. Хітранькія! — прамовіў Заяц.

— Патрэбен ты нам як у мосце дзірка! — працадзіў праз зубы Воўк.

— Так, так, так, — падтакнула Ліса.

"Яны мяне не зловяць. Я вёрткі. Калі што, уцяку ад іх", — разважыў Заяц і наблізіўся да ямы.

— Сам прыйшоў у лапы! — гукнуў Воўк і кінуўся да Зайца.

Заяц хацеў збочыць са сцяжынкі, але Ліса запыніла.

— Куды ляціш?.. Да Воўка ідзі!

Воўк ужо побач. Вось-вось схопіць.

"Буду бегаць вакол ямы, пакуль галава ў Воўка не закружыцца", — вырашыў Заяц і стаў бегаць вакол ямы. А Воўк даганяе, ні на крок не адстае.

— Шэранькі, шэранькі, шэранькі! — падахвочваючы Воўка, як у час спартыўных спаборніцтваў, закрычала Ліса.

Засопся Воўк, дыхае як кавальскі мех.

— Злаві, шэранькі! — выкрыкнула Ліса.

— Зараз злаўлю! — вымавіў Воўк і, спатыкнуўшыся аб кучу пяску, упаў у яму.

Заяц прыгнуўся і паімчаўся да Вожыка.

— Ліска! — падаў голас Воўк.

Ліса стала на краёчку ямы, нагнулася.

— Выцягні мяне з ямы, Ліска, — папрасіў Воўк.

— Як? — усклікнула Ліса. "З табою, недарэкам, я грошай не зараблю. З табою толькі абняслаўлюся", — падумала яна.

— Жэрдку апусці!

— Жэрдку ты нядаўна на кавалачкі паламаў.

— Лапу падай!

— Хочаш, каб і я туды ўвалілася? — прамовіла Ліса і адступілася ад ямы.

— Ліска-а! — як перапалоханы, завыў Воўк.

Ліса затуліла лапамі вушы і накіравалася дамоў.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

Старонку падрыхтавала Таццяна ПЛАХЕТКА

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль–рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Марыя ІЛЫЧОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com
© «Газета Слонімская»
Спасылка на «ГС» абавязковая

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Наталля СЕМЯНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 5-09-27
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак —
пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў адказваюць асабіста за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі. Рэдакцыя не вядзе перапіскі з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 1 июля	14⁰	22⁰	23⁰
ЧЕТВЕРГ, 2 июля	14⁰	23⁰	23⁰
ПЯТНИЦА, 3 июля	13⁰	25⁰	25⁰
СУББОТА, 4 июля	15⁰	28⁰	28⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 5 июля	18⁰	31⁰	31⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, 6 июля	20⁰	34⁰	20⁰
ВТОРНИК, 7 июля	24⁰	29⁰	19⁰
СРЕДА, 8 июля	27⁰	33⁰	21⁰

www.meteoprog.by

WWW GS.BY
Больше материалов и фото смотрите на нашем сайте

"Давай познакомимся"
Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе. И ваша мечта станет реальностью.
УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ!
Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? "ГС" поможет вам найти друг друга.

Всё для кровли и фасада
Металлопрофиль для заборов
прожилины
г. Барановичи, ул. Базисная, 11
/0163/ 45-89-68
/029/ 620-51-90
/029/ 234-12-22
В наличии на складе
ЧТУП «КровляПолимер», УНП 291042994

ЗЕМЛЯНЫЕ РАБОТЫ
УСЛУГИ МИНИ-ЭКСКАВАТОРА И ПОГРУЗЧИКА
- КОММУНИКАЦИИ -
- СНОС МЕЛКИХ СТРОЕНИЙ -
- ПЛАНИРОВКА УЧАСТКОВ -
- ФУНДАМЕНТЫ -
- ВОДОЁМЫ -
+375 44 771 19 77 +375 29 558 49 55
Тимофейчик Ю.В., УНП 590095887

АлексМАН производственное предприятие
СОВРЕМЕННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ
ОКНА ДВЕРИ
Пожалуй, лучшие окна!
из пвх и алюминия
раздвижные балконы
межкомнатные двери
металлические двери
г. Слоним, ул. Красноармейская, 83 а
тел./факс (01562) 4-12-11
Velcom: (029) 35-35-781, 35-35-782
ЧПУП "Алексман" УНП 590930059, собственное производство

ХОРОШИЕ ЦЕНЫ НА ОКНА ПВХ
25% оплатит наша фирма
собственное производство
Окнаград
www.oknagrad.by
Звоните г. Слоним
50-508
683-6000
ОДО «МегаБлок-Плюс» УНП 390518235

ФОТОФАКТ

СМЕРТЬ ПТИЦЫ — СИМВОЛА БЕЛАРУСИ



На слонимской трассе, недалеко от деревни Мижевичи, лежит сбитый аист. Причиной его гибели, скорее всего, стала большегрузная машина.

Снимок был сделан в субботу, 27 июня.

Алёна АЛЬКО
Фото автора

ЖИВОТНЫЕ ИЩУТ ДОМ

СПЕШИТЕ ВЗЯТЬ СЕБЕ ДРУГА

Очаровательнейшие щенки нуждаются в добрых и заботливых руках. Малышня живёт на улице, но все сытые и ухоженные (благодаря неравнодушным местным жителям). Один мальчишка и три девчонки очень хотят найти свою семью. Щенки очень добродушные, отлично ладят с местной детворой.

Возраст животных около 2,5 месяцев. Есть возможность подвоза в новую семью по городу, а также в Барановичи.

Ольга, тел. 8-033-620-40-04, или Алеся, тел. 8- 033-356-57-49

Кошечка, возраст 2 месяца, чистенькая, здоровенькая, домашняя.

Ест практически всё, к лотку приучена. Спешите забрать малышку себе.

Подвоз в новую семью гарантирован!

Ольга, тел. 8-033-620-40-04

Ведущая рубрики Татьяна ПЛАХЕТКО
tanyaplahetko@gmail.com

МОБИЛЬНЫЙ РЕПОРТЕР

ДРУЗЬЯ! С сегодняшнего номера мы открываем новую рубрику «МОБИЛЬНЫЙ РЕПОРТЁР». ЕСЛИ на Вашем смартфоне или планшете есть интересные фотографии или видео, которыми Вы хотите поделиться с нашими читателями, присылайте их нам на номер (8 029) 133-04-21 С помощью приложения Viber.

АВТОРЫ самых интересных фотографий и видеороликов БУДУТ отмечены!

Редакция газеты "Газета Слонимская" ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ творческого человека со знанием графических компьютерных программ на должность дизайнера-верстальщика газеты. Обращаться по телефону: 8 029 625 24 12.

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!
ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 2-Е ПОЛУГОДИЕ 2015 ГОДА
«Газета Слонимская» + «Отдушина»
на 1 месяц 30 000
на квартал 90 000
на полугодие 180 000

ВПЕРВЫЕ В СЛОНИМЕ
ВЫСТАВКА ЖИВЫХ ЭКЗОТИЧЕСКИХ ПОПУГАЕВ.
ТОЛЬКО ДО 2 АВГУСТА 2015Г.!
Слонимский краеведческий музей
ул. Ленина, д. 1,
с 10.00 до 19.00,
понедельник – выходной.
ИП Базылевский А.А. УНП 390355883

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 30 чэрвеня 2015 года **16:00**.
Аб'ём — сем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 3796